
КУР'ЕР ПАЛЕСКІ

ШТОМЕСЯЧНАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ГРАМАДСКА - ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

N 1
VIII. 2000

Нашым настаўнікам

Зварот рэдакцыі да чытачоў



Шаноўныя чытачы. Вы знаёміцеся з першым нумарам новай незалежнай газеты **"КУР'ЕР ПАЛЕСКІ"**, якая пачала распаўсюджвацца ў Петрыкаўскім раёне. Газета выпускаецца на правах рукапісу накладам у 299 асобнікаў, раз на месяц на 6-8 старонках. Заснавальнікам і рэдактарам газеты з'яўляецца жыхар г. Петрыкава Андрэй Мікалаевіч Яўтуховіч. Папярэдні вопыт рэдакцыі складаецца з некалькіх гадоў выпуску праваабарончых бюлетэняў, спачатку ад імя Петрыкаўскага аддзялення Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб'яднання "Беларускі Хельсінкскі камітэт", а з 1999 г. – у складзе Міжраённага праваабарончага грамадскага аб'яднання "Права і Справа".

Пасля выхаду ў красавіку - маі бягучага года рэдактара бюлетэня "Права і Справа" і групы сябраў са складу аб'яднання намі было прынята рашэнне аб выпуску незалежнай газеты агульна-грамадскага накірунку. З рэдакцыяй супрацоўнічаюць былыя аўтары праваабарончых бюлетэняў Таццяна Багданава, Макар Бычкоўскі, Федар Мікалаеў, незалежны экалагіст Міхал Козел, Язэп з падгор'я, ды некаторыя іншыя. Рэдакцыя наладзіла творчыя кантакты з незалежнымі рэдакцыямі газет і радыёкампаній, інфармацыйных агенцтваў у Беларусі і за яе межамі. Такім чынам, мы зможам інфармаваць чытачоў газеты аб падзеях і меркаваннях па шырокаму колу пытанняў з тых крыніц, якімі не вельмі ахвотна карыстаюцца дзяржаўныя беларускія СМІ.

Увогуле адной з галоўных задач рэдакцыя лічыць даступнасць старонак газеты для любой інфармацыі і для кожнага чалавека, каторы жадае выказаць у прэсе свае меркаванні па набалелых пытаннях. Мы ні ў якім выпадку не будзем абмяжоўваць кола аўтараў у залежнасці ад палітычных, нацыянальных, рэлігійных, альбо іншых поглядаў. Старонкі нашай газеты адкрытыя і для прыхільнікаў існуючай сістэмы улады і гаспадарання, і для яе супраціўнікаў. Інфармацыя павінна быць свабоднай і рознастайнай, а чытач, як галоўная асоба, мае права і магчымасць самастойна разабрацца ў фактах і зрабіць свае ўласныя вывады. Мы не будзем адмаўляць у публікацыі тым аўтарам, чые меркаванні не супадаюць з думкаю рэдакцыі па закранутым пытанні. Разам з тым, мы катэгарычна адмаўляемся падтрымліваць і друкаваць матэрыялы, якія ўтрымліваюць фашысцкія, нацыянальна-шавіністычныя погляды, заклікі да гвалту, зневажаюць чалавечую годнасць.

Захаваўшы кантакты і дасведчанне праваабарончай працы, мы будзем рэгулярна асвятляць пытанні абароны правоў чалавека ў Беларусі і за яе межамі.

Запрашаем грамадзян да супрацоўніцтва з незалежнай газетай "КУР'ЕР ПАЛЕСКІ".

Рэдакцыя газеты.

Выдавец і рэдактар Андрэй Яўтуховіч .На правах рукапісу. Тыраж 299 асобнікаў. Бясплатна. Адрас рэдакцыі: вул. Валадарскага 33а, г. Петрыкаў, Гомельская вобл., 247940, Рэспубліка Беларусь. Тэл. (02350) 22 505


Ложь. Трагедия. Непрофессионализм.

В евангелии от Иоанна написано: "В начале было Слово..." Не поднимается рука написать "Слово" о постоянной лжи, ежедневно произносимой руководителями страны, которая претендует на звание "великой". С понедельника 14 августа мир замер в напряженном ожидании известий с Баренцева моря, на дне которого 118 моряков подводного атомного крейсера "Курск" тщетно ждали помощи.

Радиослушателям и телезрителям российских радио и TV был предложен пышный букет самых разнообразных теорий и предположений, среди которых ярко выделялся традиционный призыв советских времен: ищи врага. Супостат – империалист подкрался и нанес смертельный удар. Господа адмиралы! Не делайте из меня идиота! Атомное чудовище в 150 м длиой, массой в 24000 тонны при скорости около 50 км/ч при лобовом ударе в состоянии сокрушить любую преграду. Рядом с "Курском" на дне должна бы лежать еще одна груда металлолома. Другое дело – надводный корабль, равный или больший по массе и скорости. Боюсь, что кроме крейсера "Петр Великий" поблизости ничего такого не было.

И начались игры, до боли знакомые белорусам по временам Чернобыля: несколько дней молчания, потом оптимистическая ложь, дружно поддер-жанная государственным СМИ. Лишь в среду 16-го после бесконечных сове-щаний названо точное число (!) уже погибших к тому времени моряков, а т.наз. "спасательные работы" превра-тились в тренировочные спуски рос-сийских аппаратов, заведомо беспо-лезных при крене спасаемого судна более 40 °.

Далее "появилась" мина времен 2-й мировой войны, однако адмирал-фантаст получил отпор от своего коллеги, заявившего, что нужно обложить весь корпус "Курска" такими минами, чтобы его можно было повредить. Накапливалась ложь, но накапливалась и правдивая информация, разоблачавшая высокопоставленных "совещантов". По мере приближения норвежской спасательной экспедиции рушилась информационная блокада, столь любимая нашими генералами, и все реальнее становился факт гибели экипажа "Курска". По дангным газеты "Вашингтон пост", с 14-го "Курск" не подавал признаков жизни. В Норвегии и ФРГ 12-го были зафиксированы два взрыва в районе катастрофы. Второй взрыв оценен в 3,5 балла по шкале Рихтера - это землетрясение средней силы. Трудно ожидать, что после такого кто-либо на лодке остался жив. Но военные чины, желая спасти престиж ВМФ и свои лампасы, упорно накручивали ложь на ложь. Всё это лопнуло 20 августа: нормальные, мастеровитые, должным образом оснащенные люди, не разглагольствуя о "Великой Норвегии", в течение нескольких часов сделали свою работу.И не их вина, что их так поздно попросили о помощи. Но и в этот трагический момент командование ВМФ продолжало лгать: норвежские водолазы опровергли сообщение о том, что поврежденный аварийный люк не позволяет продолжить спасение моряков.



Атомный ракетоносец покидает базу. Вернется ли он к родным берегам?

Россия, претендующая на роль великой военно-морской державы ,оказалась технологически, морально и профессионально несостоятельной перед крошечной Норвегией, да и перед другими странами.

Невольно в памяти возникают исторические параллели, касающиеся 18 -20-х чисел августа: 18 августа, более 750 лет назад окончил свои дни палач средневековья Чингисхан, "автор" сотен тысяч трупов по всему миру. 19.VIII.35 г. Адольф Гитлер на референдуме получил 95,7% голосов "за", давших миру"-новый порядок", о котором весьма одобрительно высказывалось некое лицо, также получившее 60 годами позже около 80% голосов. Десятки миллионов жертв во II мировой войне.

19.VIII.37 г. состоялось судилище по делу троцкистко-зиновьевской группы, положившее начало невиданным в истории политическим репрессиям. По разным данным, в резне, учиненной г. И.Сталиным и его подручными, СССР потерял до 14 миллионов человек, в т. ч. все командование Красной Армии, до командиров полков. Не здесь ли основа несчастий, преследующих Вооруженные Силы РФ и сегодня?

19.VIII.91 г. наследники И.Сталина объявили о создании ГКЧП. Три жертвы в Москве, не считая застрелившихся ГКЧПистов. Оставшиеся в живых заговорщики благоденствуют в Госдуме и в некоторых губерниях.

По странному совпадению, эти же дни августа 2000 г. стали днями создания братской могилы для моряков с "Курска". Светлая им память!

"Мертвые срама не имут"- говорили на Руси. Но и рассказать об истинных причинах своей гибели они не могут. Что и требовалось командованию для создания правдоподобной версии происшедшего. По авторитету руководилей Вооруженных сил и по авторитету Президента РФ нанесен мощный удар. Десятки общественных организаций, независимая пресса, Государственная Дума России требуют тщательного расследования лричин катастрофы и гибели моряков.

На борту ракетоносца погибли два белоруса: ст. пом. командира, капитан I ранга Сергей Дудко и командир БЧ 7 капитан-лейтенант Александр Садков.

Оба, находясь во II отсеке корабля, погибли в первые секунды катастрофы.

Беларусь все теснее привязывается к России, в том числе и в военном отношении. Нельзя исключить что в недалеком будущем количество белорусских парней, проходящих службу в армии нашей восточной соседки, может значительно увеличиться. Я бы не хотел, чтобы мои сыновья находились на борту судна типа "Курск", да и другим этого не желаю. Белорусские матери, будьте бдительны!

Андрей Явтухович

Мировая и российская пресса внимательно следила за развитием событий, связанных с гибелью атомной подводной лодки "Курск". Белорусские государственные СМИ практически обошли молчанием эту тему.

Мы предлагаем читателям обзор зарубежной прессы за 15 - 22 августа 2000 года.

"Владимир Путин, как это делалось в советские времена при катастрофах национального масштаба, остаётся приверженцем секретности и лжи.

Раньше это оправдывалось честью социализма, теперь предпочитают говорить о чести нации. Но первый рефлекс был и остаётся: принести в жертву человеческие жизни ради то-го, чтобы лидеры сохранили лицо.

В понедельник российский флот сообщил, что в результате столкновения с чем-то подлодка потерпела аварию и залегла на дне моря, что с ней поддерживается радиосвязь, а у страны есть технические возможности спасти экипаж. В этом сообщении правдой был только сам факт аварии.

Только в среду Путин после раз-го-вора с Клинтоном разрешил штабу флота прибегнуть к иностранной по-мощи. С момента аварии впустую были потеряны4дня."

***"Либерасьон"**, Париж*



Дмирий Старосельский, трюмный матрос, IV отсек. Погиб в первые минуты аварии

"Катастрофа "Курска" - это не просто трагедия её несчастных матросов, но и предостережение, насколько опасно пытаться содержать по дешевке атомный флот. Российские и американские эксперты спорят о причинах катастрофы, но в любом случае главная причина в том, что из-за нехватки средств подлодки очень редко выходят в море, что за ними плохо ухаживают, что команды мало тренируют. Эта проблема российского флота опасна не только для моряков, но и для окружающей среды."

***"Нью-Йорк таймс"**, Нью Йорк.*

"По доверию к военному руковод-ству, точно также напускающему ту-ман на всё, что происходит в Чечне, нанесен серьёзный удар, а значит и по доверию к Главнокомандующему. Не ясно при этом, когда и как Президенту сообщали о катастрофе "Курска", и не известно, оранизовывал ли он с самого начала кампанию замалчивания, или стал её жертвой. Ввиду основанного на понятиях престижа мышления Путина кажется, что Кремль вряд ли сумеет извлечь урок из случившегося. Скорее, как всегда, начнут искать ответ на ствры й русский вопрос "кто виноват". Полетят головы пары адмиралов, катастрофу примут, как неизбежный удар судьбы, тем более, море есть море, и всё пойдет по-старому."

***"Вельт"**, ФРГ.*

Вопрос: "...военные, скрывая информацию и ведя непонятные работы на месте аварии подводной лодки, тем самым намереваются устроить, как здесь говорят, братскую могилу. Согласитесь ли Вы с таким мнением?"
Ответ: "К сожалению, да. Дело в том, что...очень часто информация идет из источников, очень близких к тем, где на самом деле это происходит. Поэтому уже 14-го числа большинство офицеров, с которыми мы разговаривали, говорили о том, что военные сделают всё, чтобы эту лодку не поднять. Сейчас, когда за эти дни всё это накопилось, мы уже вынуждены констатировать как ту правду, которая есть на самом деле."

Вопрос: "Выстраивают ли Ваши источники какую-то собственную, более-менее стройную конструкцию случившегося на атомной подводной лодке?"
Ответ: "Часть людей, которые давали нам информацию, присутствовали на военном учении, и поэтому уже тогда было предположение о том, что произоцла непреднамеренная атака нашего же корабля.



Лянчин Г.П., командир корабля, II отсек. Погиб в первые минуты аварии.

Вопрос: Не повторит ли этот сценарий ситуацию с подводной лодкой "Комсомолец", когда будет построен саркофаг?"
Ответ: Это не саркофаг, это будет действительно братская могила. Мы знаем самих военных, их действия можно предугадывать, Как правило, они поступают по одному и тому же отработанному сценарию. Если там действительно никого (*в живых* - ред.) нет, или норвежские и английские спасатели не помогут, то, скорее всего, там длительное время будет братская могила."

Из интервью Председателя правления Международной экологи-ческой организации "Green club" (Мурманск) г-жи Елены Василье-вой, данного корреспонденту рус-ской редакции радио "Свобода" Андрею Королёву.

"Норвежские и британские спасатели, работавшие на "Курске", столкнулись со множеством технических проблем.

Но главным препятствием оказалось противодействие российской стороны от психологической обработки до предоставления ложных сведений и прямого саботажа."

***"Новые Известия"**, Москва.*

"Как бы цинично это ни звучало, но, если бы не авария, то ползучая атомня катастрофа на северном побережье России никогда не привлекла бы к себе того внимания общественности, которого она заслуживает."

***"Франкфуртер Рундшау"**, ФРГ.*

Фотоснимки перепечатаны из газеты "Комсомольская правда в Белоруссии". Мы выражаем благодарность печатным изданиям и редакциям радиостанций, предоставившим информацию для нашей газеты.

А электрыкам усё да лямпачкі!

У газеце “Петрыкаўскія навіны” № 64 ад 16 жніўня б.г. у рубрыцы “Сатырычным пяром” з’явілася заметка сп. І. Дзімтрыева “І чаму мы не японцы?” А сапраўды, чаму?

На думку сп. Дзітрыева таму менавіта, што нашы электрыкі падчас замены слупоў у горадзе не ходзяць па хатах і не прапануюць грамадзянам ляльку, адэкалон, альбо яшчэ нешта. Пры гэтым ім належыць прасіць прабачэння за тыя нязручнасці, што ўзніклі ў выніку рэгулярных адключэнняў электрычнай энергіі ў горадзе. А жыхары дамоў па вул. Інтэрнацыянальнай і Чалага дык і ўвогуле засталіся без электрычнасці.



Вось, маўляў, каб прыйшлі тыя электрыкі, ды прэзентавалі гаспадыні, ў якой папсаваліся прадукты, свае прабачэнні і нейкі падарунак, то справа наладзілася б, і мы сталі б у той жа момант японцамі. Можа яно і так, я не супраць. Няхай я стану ніндзяю, тады і мне цукерку дадуць, ды яшчэ й прабачэння папросяць!

Але справа выглядае больш сур’ёзна. Вось што сцвярджае інжынер-электрык з Мінска сп. Мікалай Шуліка: “Нечаканае адключэнне электрычнай энергіі, асабліва калі адключаецца, а потым ізноў уключаецца трансфарматарная падстанцыя, вельмі небяспечнае для любых электрычных прылад і прыбораў. Тэлевізары ды халадзільнікі перажываюць момант адключэння больш-менш спакойна, а вось кампутарная тэхніка, калі яна не абароненая спецыяльным прыстасаваннем, выходзіць са строю. У гэты момант кампутар можа згубіць частку электроннай памяці і закладзенай інфармацыі. Добра, калі абыдзецца простай перазагрузкай пры дапамозе сыстэм-най дыскеты, бо можа спатрэбіцца пе-разагрузка асобных праграм са спецыяльных, даволі каштоўных праграмных дыскаў. Уявіце сабе, што згубленая непрадубліраваная інфармацыя ў банку, ці, скажам, у праектным інстытуце! Яшчэ горшыя наступствы пры не-чаканым уключэнні падстанцыі. Звы-чайна ў гэты момант адбываецца моц-ны выкід напружання ў электрычнай сетцы, які можа асягнуць імгненнага імпульсу ў 280 – 300 вольтаў замест стандартных 220. Ад гэтага імпульсу могуць быць прабітыя трансфарматары ў тэлевізійных і радыёпрыёмніках, прабіваюцца абмоткі рухавікоў у халадзільніках, “ляцяць” мікрасхемы і паўправаднікі ў электроннай апаратуры, могуць перапаліцца асвятляльныя прыборы. У выніку электрычнае абсталяванне часцяком патрабуе каштоўнага рамонту, калі ён яшчэ магчымы, а то і ўвогуле прыдзецца выкідаць з хаты шматмільённае жалеззе.”

З нашага пункту гледжання, аб адключэннях электрычнасці ў Петрыка-ве, якія з 15 – 17 жніўня ахапілі і іншыя вуліцы горада, трэба было б пісаць не толькі ў сатырычным артыкуле.


Мала каго задаволяць прабачэнні электрыка, калі ў чалавека загінуў каштоўны прыбор, *што, дарэчы, і здарылася ў сп. Таццяны Сярдзюк: прабіўся трансфарматар яе тэлевізара і амаль не здарыўся пажар у яе доме.* Тут, хутчэй, трэба будзе праз суд патрабаваць кампенсацыі за нанесены матэрыяльны ўрон. Але ж суддзі запатрабуюць цэлыя стосы спраў, актаў, страховак, ды іншых папер. А энергетыкі ж наўрад дадуць пацверджанні сваёй уласнай віны. Вось і застануцца грамадзяне са сваімі праблемамі сам-насам. У лепшым выпадку атрымаюць цукерку ... ад японцаў.

Прасцей было б рэгулярна абвяшчаць праз тыя ж “ПН”, што ў такі і такі перыяд магчыма запланаванае адключэнне электрычнасці на такіх і такіх вуліцах, у нас жа “рыначны сацыялізм”, планавая эканоміка! Ды даць кароткую інструкцыю: “Выцягвайце, даражэнькія, правады з разетак, ды не ўключайце, пакуль не ўпэўніцеся, пачакаўшы з паўгадзіны, што электрычнасць падаецца стабільна. Бо ў іншым выпадку вашыя прэтэнзіі да ўладаў прымацца не будуць.” Але дзе ж там, якія яшчэ вам папярэджанні! Што называецца: “Усё для народа - нічога для чалавека.” А потым можна і “сатырычным пяром” гэтак жахнуць, што ва ўсіх вочы стануць вузкія: во, і мы ўжо японцамі сталі.

Язэп з падгор’я

Рэдакцыя просіць грамадзян паведамляць лістом альбо па тэлефоне аб выпадках пашкоджанняў бытавой электратэхнікі і іншых непрыемнасцях, якія маглі адбыцца ў час правядзення работ па замене электрычных слупоў у нашым горадзе.

Пра грошы нашы і вашы



У Польшчы з 1995 г. дзейнічае закон аб дзяржаўных гарантыях для ўкладчыкаў у прыватных банках. У выпадку нечаканага банкруцтва банка спецыяльны страхавы фонд гарантуе атрыманне ўклада на суму да 20 тысяч еўра ў нацыянальнай альбо замежнай валюце. Пры гэтым першая тысяча еўра кампенсуецца ў поўным памеры, а астатнія - на ўзроўні 90%.

Страхавы фонд ствараецца за кошт штогадовых адлічэнняў банкаў у памеры 0,4% актываў банкаў. Штогод гэты адсотак памяншаецца, і ў 2003 годзе складзе 0,16%. Страхавы фонд падпарадкоўваецца выключна вышэй-шаму заканадаўчаму органу - Сейму Рэчы Паспалітай, а выканаўчая ўлада не мае прамога дачынення да гэтага Фонда.

У ЗША пасля “вялікай дэпрэсіі” 1929 - 30 гадоў прыняты закон аб дзяржаў-ным страхаванні ўкладаў грамадзян у прыватных банках.

Укладчык у выпадку банкруцтва яго банка атрымлівае кампенсацыю ў памеры 100% ўклада. Пры гэтым грошы можна атрымаць літаральна на наступны дзень пасля абвяшчэння аб банкруцтве. Большасць укладчыкаў даведваюцца аб ліквідацыі сваіх банкаў у момант атрымання перавода на суму свайго ўклада ад страхавога фонда.

Рэспубліка Беларусь у вырашэнні гэтага пытання пайшла, здаецца, па шляху Ізраіля, дзе ўклады грамадзян у прыватных банках дзяржавай не абараняюцца і не гарантуюцца. Праўда, і банкі ў Ізраілі больш надзейныя ў параўнанні з беларускімі.

Ва ўсякім выпадку, працаўнікі Петрыкаўскага аддзялення “Беларусбанка” не змаглі паведаміць нічога канкрэтнага аб існаванні і дзеянні адпаведнага нацыянальнага закона.

Фёдар Мікалаеў

У апошні момант

Калі гэты нумар газеты ўжо быў перададзены ў друк, мы атрымалі інфармацыю аб тым, што дключэнні электрычнасці мелі даволі сур’ёзныя наступствы: у дамах па вул. Валадарскага выйшлі са строю некалькі тэлевізараў і халадзільнікаў. Гавораць нават, што ў шпіталі Петрыкава загінулі людзі, якія не змаглі карыстацца адпаведнымі прыборамі. *(рэд.)*

БЕЛАРУСКІ КАМПАЗІТАР - КАНКУРЭНТ АМЕРЫКАНСКІХ ДЖАЗМЭНАЎ?

У ЗША выпушчаны кампакт - дыск “Mystery of the Dark Ocean” (“Таямніца Цёмнага Акіяна”), складзены ў стылі cool-jazz з твораў вядомага беларускага кампазітара Зміцера Яўтуховіча, які зараз жыве ў г. Саўт-Рыверы, штат Нью Джэрзі.

У кампакт - дыску 17 інструментальных апрацовак і арыгінальных п’ес, складзеных Зміцерам у 1984 - 1998 г.г. у Гомелі, Мінску, Лідзе, Петрыкаве, Львове і Саўт Рыверы.

Выканаўцамі, акрамя братоў Аляксея (скрыпка) і Зміцера (раяль, сінтэзатар) Яўтуховічаў, былі вядомыя беларускія і расійскія джазавыя выканаўцы Алесь Сіпягін (труба), Александр Герасімовіч (гітара), Сяргей Гурберашвілі (сакс-сапрана), Уладзімір Батчын (клавішныя) ды іншыя музыканты.

Назву дыску дала п’еса, прысвечаная дачцэ кампазітара Валерыі. Дарэчы, кожны з выконваемых твораў прэзэнтаваны той ці іншай асобе. Дыск пачынаецца з “Інтрадукцыі”, прысвечанай памяці нядаўна памёрлага буйнейшага беларускага кампазітара, Народнага Артыста СССР Яўгена Глебава. Ёсць у дыску прысвячэнні Ігару Лучанку, старшыні Саюза кампазітараў РБ; прафесару кампазіцыі, педагогу З.Яўтуховіча ў класе кампазіцыі Беларускай акадэміі музыкі Зміцеру Смольскаму, асобным выканаўцам групы, сваякам. Ёсць і вельмі прыгожая апрацоўка “Салодкай пастаралі”, даўняга фартэп’яннага твору З.Яўтуховіча, які прысвечаны бацькам кампазітара Таццяне і Андрэю Яўтуховічам, што жывуць зараз у Петрыкаве.

Зміцер Яўтуховіч больш знаёмы беларускім аматарам эстраднай музыкі ў якасці аўтара шматлікіх папулярных песень, у тым ліку для дзяцей. Часта гучыць на Беларускім радыё яго цудоўная “Калыханка”, якую ахвотна выконваюць такія спевакі, як Лявон Барткевіч і Данчык. Не менш папулярныя ягоныя песні “Даставай, Язэп, гармонік”, “Чаборовая паляна”, “Беларускія дзяўчаты” ды інш. Але не ўсе ведаюць, што ў свой час Зміцер адрозніваўся, як аутар менавіта інструментальнай музыкі, у тым ліку і ў класічных формах. Ім складзены канцэрт для скрыпкі з аркестрам, цыкл п’ес для фартэп’яна, творы для камернага аркестра, квартэта і мноства другой інструментальнай музыкі.

Сам Зміцер добра валодаў іншымі інстру ментамі, валодаў рознастайнымі выканаўчімі стылямі і майстэрствам джазавай імправізацыі, што прыцягнула да яго ўвагу буйных эстрадных мастакоў Беларусі. Кампазітар працаваў у ансамблях Песняры”, “Сябры”, і ў кожным з іх выконваліся яго творы, галоўным чынам - песні, але любоў да інструментальнай музыкі засталася



На мой погляд, сваёй апошяй працаю Зміцер яшчэ раз пацвердзіў свой талент меладыста і асабліва майстэрства аранжыроўшчыка і высокі густ музычнай гармоніі. Настаўнік Зміцера ў класе гармоніі, знакаміты кампазітар Ул. Алоўнікаў казаў, шро за доўгія гады кансерваторскай працы ён упершыню сустрэў такі абвостраны, вышуканы і патрабавальны гарманічны слых. А навучанне ў класе кампазіцыі прафесара Зміцера Смольскага дала Яўтуховічу майстэрства шыкоўнай апрацоўкі нават самых дробных музычных матываў. Невялічкія, на 2 - 4 такты мелодыі разгортваюцца ў дзівосным, фантастычным гучанні джазавай аранжыроўкі, аздобленыя высокім майстэрствам групы выканаўцаў - аднадумцаў.

Кампакт-дыск літаральна запоўнены хітамі, з якіх часам цяжка выбраць лепшы. І цяжка знайсці нешта роўнае па яскравасці і жанру ў беларускай джазавай музыцы. Мне асабіста найбольш падабабаюцца два творы: “Подых гарачага лета” і “Упарты Бас ”. З лірыкі, канечне ж, “Пяшчота” і “Тамніца Цёмнага Акіяна”. У дыску знойдзецца музыка на любы густ, ад самай “забойнай” да звышлірычнай. Дыск прыхільна прыняты такімі майстрамі беларускай эстраднай музыкі, як Народны Артыст СССР Ігар Лучанок і Народны Артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка.

На гэтым фоне дзіўнаю падаецца заўвага музыказнаўцы Элеаноры Езерскай, што Зміцер Яўтуховіч у ЗША нібыта загубіў свой талент, амаль зводзіць канцы з канцамі, працуючы рэстаранным музыкантам і падрабляючы чысткай дываноў у прыватных асоб.

Цікава, ці зможа сп. Езерская нагадаць хоць аднаго з беларускіх рэстаранных музыкантаў, які б выпусціў аўтарскі дыск стыльнга джазу на 66 мінут гучання? Да таго ж трэба ўлічыць, што беларускі джаз у беларускім выкананні гучыць упершыню ў дзяржаве, дзе нарадзілася гэтае мастацтва, дзе ўзровень джазавага выканаўства і традыцыі яго надзвычай высокія, а канкурэнцыя ў гэтай галіне, дык ой! Тут трэба казаць пра даволі сур’ёзнае здарэнне: упершыню на радзіме джазу з’яаіўся канкурэнт з краіны пад назвай Беларусь, і трэба вітаць гэта, як сапраўдны патрыятызм.

На заканчэнне адна перасцярога: аматары прымітыўнай дыскатэкі наўрад ці знойдуць нешта цікавае для сябе сярод твораў Зм. Яўтуховіча. Пад гэтую музыку нельга танцавць, яе можна толькі слухаць, як і усякую класіку, да якой зараз залічан і прафесійны джаз. І як уся-кая класіка, музыка Яўтуховіча аж ззяе інтэлектам, якога нам так не хапае, у тым ліку і ў эстрадным мастацтве. Цікавую характарыстыку пачутага даў рабочы аднаго з прадпрыемстваў Петрыкава: “Ведаеш, *гэта* пасля ста грамаў не патанцуеш. Гэта трэба слухаць на ўласнай віле, у адпаведным настроі і, пажадана, дзе небудзь на Азорскіх астравах.” Цяжка сказаць лепш.

Я віншую Зміцера Яўтуховіча з чарговым творчым поспехам.

Таццяна Багданава

На здымку: кампазітар Зміцер Яўтуховіч, 1993 год.

ВАШАЕ ДЗІЦЯ - ПАДЛЕТАК КУРЫЦЬ?

У ЯГО НЕВЯСЁЛАЯ БУДУЧЫНЯ.

Сусветная Арганізацыя Здароўя (САЗ) апублікавала даклад аб курэнні сярод непаўналетніх. Даклад грунтуецца на выніках даследванняў,удзельнікамі каторых сталі больш за 50 тысяч падлеткаў з 12 краін свету.

Даследчыкі прадставілі даныя аб звычцы дзяцей да курэння, уключаючы статыстыку дзяцей-курцоў, іх меркаванні адносна асвятлення шкадлівых наступстваў курэння ў сродках масавай інфармацыі ды мэтазгоднасці праграм па барацьбе з ужываннем тытунёвых вырабаў. Вось як пракаментавала даклад сп. Ліан Рылі, супрацоўніца аддзела УАЗ, які заняты барацьбой з курэннем: "Нас вельмі здзівіла, што агромністая колькасць навучэнцаў ва ўзросце ад 13 да 15 гадоў пачала курыць, не асягнуўшы дзесяцігадовага ўзросту. Па ацэнках УАЗ прыблізна 250 мільёнаў сённяшніх дзяцей і падлеткаў, калі стануць дарослымі, заўчасна памруць у выніку звычкі курыць. 70 адсоткаў з іх - жыхары краін т.зв. "трэцяга свету". Спецыялісты мяркуюць, што пераважная большасць падлеткаў не змогуць адмовіцца ад гэтй шкоднай звычкі і будуць працягваць курыць напрацягу ўсяго жыцця. Палове з іх наканавана заўчасна загінуць ад хвароб, узнікшых у выніку шкадліва-га ўздзеяння тытуню на арганізм чалавека."

Па словах Ліан Рылі, аўтары даследванняў падкрэсліваюць, што больш за дзве траціны дзяцей, якія ўжываюць тытунь, хацелі б адмовіцца ад курэння. "Традыцыйны падыход у барацьбе з курэннем - гаворыць сп. Рылі - аддае перавагу прафілактыцы, гэта значыць, папярэджанню ў дзяцей жадання закурыць упершыню. Мы ж марым пачаць праграмы, мэта якіх - прымусіцьпадлеткаў адмовіцца ад ужывання тытунёвых вырабаў. Пакуль што такія праграмы існуюць далёка не ўсюды.

Вынікі даследванняў паказалі таксама, што асветніцкая работа адносна шкадлівасці курэння малаэфектыўная, і што неабходна зрабіць вельмі многа, каб яна рэальна паўздзейічала на адносіны падлеткаў да курэння."

У дакладзе САЗ адзначаецца таксама, што найбольшая колькасць падлеткаў - курцоў жыве ў краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, у тым ліку ў краінах былога Савецкага Саюза.

На першым месце па колькасці падлеткаў, якія кураць тытунь, знаходзіцца Украіна. Там тытунёвыя вырабы ўжываюць каля 70% хлапчукоў і дзяўчынак.

За Украінаю ідзе Польшча і Расія.Самая малая лічба падлеткаў курцоў адзначана ў краінах Азіі сярод дзяўчынак.

Супрацоўнікі Сусветнай Арганізацыі Здароўя адзначаюць, што прыкладна палова ўсіх удзельнікаў праведзенага даследвання ў дзяцінстве адчула ўздзеянне гэтак званага "пасіўнага курэння", калі яны былі вымушаны дыхаць дымам папяросаў альбо цыгарэт, што курылі іх сваякі.

(Матэрыял атрыманы пры дапамозе радыё ***Voice of Ameryca****, пераклад рэдакцыі.)*

Овес нынче дорог, не укупишь...

У вас нет миллионов на лекарства? Взгляните под ноги: вы топчете свои деньги. И здоровье...

Мы начаем цикл публикаций по использованию лекарственных растений в профессиональной и народной медицине. Некоторые пояснения:

· Статьи печатаются по книге "Лекарственные растения и их применение", изд. 7-е, Мн., 1976г.

· Названия растений приводятся на русском, белорусском языках и по латыни. В отдельных случаях приводятся местные названия.

· Стандартная рецептура по приготовлению отваров и настоев трав, корней, плодов и цветов почти для всех видов лекарственных растений одинакова: 15 – 20 гр. на 200-300 гр. кипятка.

· **Осторожно! Некоторые растения ядовиты. Превышение дозы (D.S.) и нарушение рецептуры (Rp:) может привести к непредсказуемым последствиям. Настои таких растений следует применять под контролем врача и хранить в недоступном для детей месте**

· При сушке сырья его влажность не должна превышать 12 – 15%. Сушка подавляющего большинства лекрственных растений и корней производится в тени при температуре 20 – 25 С. Несоблюдение технологии сушки может привести к потере сырьём лечебных свойств.

· Корни и плоды лекарственных растений обычно заготавливаются осенью, в некоторых случаях – до декабря, цветы и трава – в период цветения.

Приводим данные о двух лекарственных растениях, сбор и заготовка которых не представляют никаких сложностей и возможны практически в неограниченных количествах:

Полынь обыкновенная, чернобыльник; палын звычайны – Artemisia vulgaris L.

(продолжение на стр. 7)

Многолетнее травянистое растение высотой 50-150 *см* с ветвистым корневищем и с несколькими стеблями, образующими куст. Стебли прямостоячие, ребристые, буро-фиолетовые,внизу деревенеющие, в верней части ветвистые. Листья крупные, 3-15 *см* длины и 2-12 *см* ширины, сверху тёмно-зелёные, снизу беловато- или серовато-войлочные, перистоpазделенные (кроме верхушечных - цельных) на удлиненные доли шириной 1-8 *мм*, Цветки мелкие, собраны в корзинки, образующие длинное, слегка поникающее метельчатое соцветие. Рис. 1.




рис. 1 Полынь обыкновенная *Artemisia vulgaris* L.

Цветет в июле-августе. Встречается по всей Беларуси, образуя заросли на пустырях, огородах, возле жилья.

С лекрственной целью применяются трава и корни чернобыльника - Herba et radix Artemisiae vulgaris. Собирают олиственные верхушки стеблей во время цветения, причём они не должны содержать одревесневших частей. Корни выкапывают осенью, очищают от земли, но не моют, сушат в проветриваемом помещении.

В медицинской практике применяется для улучшения аппетита, как успокаивающее, при неврастениях, болях и спазмах в кишечнике, желудочных и кишечных диспепсиях.Трава полыни обыкновенной входит в состав микстуры по прописи М.Н.Здренко.

Препараты из полыни обыкновенной приготавливаются и применяются следующим образом:

1. Одну ст. ложку травы залить 300 мл воды, нагреть до кипения, но не кипятить, закрыть и обернуть сосуд, оставить на 2 часа, а затем процедить. Принимать по 50 *г* за 30 минут до еды.
2. Одну ст. ложку корней залить 1/2 литра вина типа рислинг, нагреть до кипения, закрыть и обернуть сосуд,оставить на 2 часа, а затем процедить. Принимать по 1 ст. ложке (при гастрите с пониженной кислотностью).

В народной медицине отвар всего растения употребляется при гастритах, отвар корня или всей травы - при нервных заболеваниях и как противосудорожное средство.

В Беларуси наряду с полынью обыкновенной часто встечается Полынь горькая - *Artemisisa absinthium* L., однако её свойства, дозировка и рецептура препаратов из неё несколько отличаются от полыни обыкновенной, о чем мы расскажем в следующих выпусках.

Пырей ползучий; пырнік паўзучы - Agropyron repens L.

Многолетнее травянистое растение с длинным ползучим корневищем и приподнимающимися, гладкими, голыми, облиственными стеблями. Листья узколинейные, шероховатые, сине-зелёные. Цветки с зелёными чешуями собраны в прямые, длинные и узкие колосья. Рис. 2. Цветет в июне-июле.

Засоряет все без исключения полевые культуры. Встречается по всей территории Беларуси часто и обильно.

Лекарственным сырьём служит корневище пырея - Rhizoma graminis. Его собирают весной и осенью, очищают от стеблей, листовых влагалищ и корешков, обмывают и сушат на воздухе. Готовое сырьё состоит из корневищ или их кусков толщиной 2 мм.

В виде отвара употребляется как обволакивающее и легкое слабительное средство. Корневище входит также в состав мочегонного сбора.



рис.2 Пырей ползучий *Agropyron repens* L.

В настоящее время в медицинской практике корневище пырея применяется редко. Между тем, оно содержит углеводы, главны м из которых является полисахарид трицитин, в нем содержатся фруктоза, маннит, инозит, агропирен, глюкованилин, жирное и следы эфирного масла, небольшое количество витамина С, каротин, сапонин и др.

Приводим рецепт отвара из корневищ пырея ползучего:

Rp: Decocti rhizomatis Agropyri repentis 20,0 - 200,0.

D.S. По 1 ст. ложке 3 раза в день (как обволакивающее и лёгкое слабительное).

В народной медицине корневище пырея применяется более широко. В виде отвара его пьют при недержании мочи, дают пить и купают детей при диатезе, детских экземах, принимают от боли в груди, при лихорадке, желтухе, неправильных месячных, ломоте.

Людмила Зубарь

Редакция благодарит Л.П.Зубарь за подготовку материала

РЭПЛІКА

Мы накіравалі прапанову аб супрацоўніцтве на імя старшыні МПГА "Права і Справа" сп. В. Тарабея. У адказ мы атрымалі, за подпісам заг. грамадскай прыёмнай сп. Э.Ларына, ліст, які інакш як дзіўным, не назавеш. Акрамя таго, што ў лісце ўтрымліваецца фармальная адмова праваабаронцаў супрацоўнічаць з пакуль што адзінай незалеж най газетай у раёне, некаторыя заўвагі сп. Ларына папросту зняважальныя. Тут і разважанні аб "несерьёзности данного начинания", і аб атсутнасці сродкаў і тэхнікі (і што за звычка, адразу лічыць грошы ў чужой кішэні!), і нават мерказанне аб тым, што газета будзе "бульварным изданием на разные темы". Такія разважанні сп. Ларына мімаволі наводзяць мяне на думку, што кіраўнікам праваабарончай арганізацыі спатрэбіўся ўвесь іх нядаўні бюракратычны вопыт, каб адшукаць прычыну для хоць бы знешне прыстойнай адмовы праваабаронцаў супрацоўнічаць з незалежнай прэсай у раёне. Шкада толькі таго "большинства членов организации" на якое спасылаецца сп. Ларын.

А.Яўтуховіч

НАВІНЫ ПРАВААБАРОНЧАГА РУХУ
на Гомельшчыне

Калі вы дзе-небудзь убачыце прыведзены ніжэй надпіс альбо эмблему (запаленая свечка, аблытаная калючым дротам), ведайце: вы сустрэліся з Міжнароднай Амністыяй - буйнейшай і аўтарытэтнай праваабарончай арганізацыяй. Што такое "Міжнародная Амністыя" (МА)? Падаем інфармацыю з анкеты індывідуальнага сябра МА (друкуецца на расійскай мове):

Amnesty INTERNATIONAL
На Беларусі

"МА – это независимое, политически беспристрастное всемирное движение обыкновенных людей, преданных следующему принципу: борьба за права человека – это международная обязанность. Основанная в 1961 г., МА действует под председательством Международного исполнительного комитета, избранного её членами. Она не ищет и не принимает финансовую помощь от правительств. Финансируемая своими членами и сторонниками со всего мира, сочувствующими её деятельности, МА занимает положение советника в ООН. Ей была присуждена Нобелевская премия мира и Премия прав человека ООН . Основанная на принципах Всеобщей декларации прав человека, МА борется за:

- ***безоговорочное освобождение всех узников совести, т.е. людей, которые находятся в заключении за свои убеждения, цвет кожи, пол, этническое происхождение, язык и религию, при условии, что они не применяли и не поддерживали насилия***
- ***справедливый и своевременный суд для всех политических заключенных***
- ***отмену пыток и смертной казни для всех заключенных***
- ***прекращение внесудебных казней и "исчезновений"***

Индивидуальные члены МА получают регулярную информацию со всего мира о ситуации прав человека. Если возможно, в тех случаях, когда международное влияние может помочь, по запросу Международного секретариата, они направляют обращения властям по поводу заключенных.

Индивидуальные члены не участвуют в работе по своей стране как члены МА. Они также не собирают информацию для МА о нарушениях прав человека в своей собственной стране. За эту часть работы несет ответственность Международный секретариат.

Индивидуальные члены не имеют права делать публичные заявления от имени Международной амнистии или выступать в качестве представителей организации". (*канец цытаты*)

Міжнародная Амністыя налічвае больш за 1,5 мільёна сябраў амаль ва ўсіх краінах свету. Яе акцыі-звароты да кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў звычайна вельмі эфектыўныя і выніковыя, паколькі грунтуюцца на дасканальна праверанай інфармацыі аб парушэннях правоў чалавека ў той ці іншай краіне. У Беларусі існуе прызнаная Міжнародным сакратарыятам суполка МА з цэнтрам у Гомелі. Яна мае некалькі сябраў у Петрыкаве. Петрыкаўскія актывісты МА пачалі сваю працу з распаўсюджвання тэматычных бюлетэняў МА , якія асвятляюць пытанні права грамадзяніна на адмову ад вайсковай службы па перакананнях сумлення, праблемах тартураў, праблеме забароны смяротнага пакарання, навучання насельніцтва правам чалавека. "МА на Беларусі" падрыхтавала ўжо 5 такіх бюлетэняў.

Па запыту Міжнароднага сакратарыята МА ў раёне праводзіцца міжнародная акцыя па сбору подпісаў пад зваротам да Караля Саудаўскай Аравіі ў абарону правоў двух зняволеных у гэтай краіне: Мухамеда аль-Хаека і Сані аль-Сайеха. У звароце ўтрымліваецца заклік да ўраду Саудаўскай Аравіі ратыфікаваць асноўныя пагадненні ААН па правах чалавека.

"Міжнародная Амністыя на Беларусі" заклікае жыхароў Петрыкаўшчыны падтрымаць высокародную акцыю.

Рэдакцыя будзе рэгулярна інфармаваць грамадскасць аб наступных акцыях "Міжнароднай Амністыі".

Матэрыял падрыхтаваў
Андрэй Яўтуховіч.

РЭДАКЦЫЯ САРДЭЧНА ВІНШУЕ ЎСІХ ПЕДАГОГАЎ І НАВУЧЭНЦАЎ, УСІХ ПРАЦАЎНІКОЎ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ З ПАЧАТКАМ НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА. ЖАДАЕМ ВАМ ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ І ТВОРЧЫХ ПОСПЕХАЎ!

Газета друкуецца на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь. Меркаванні аўтараў не заўсёды падтрымліваюцца рэдакцыяй. Рэдакцыя не нясе адказнасці за недакладную інфармацыю, пададзеную аўтарамі.

Надрукавана ў выдавецкім цэнтры Гомельскага абласнога грамадскага аб'яднання "Грамадзянскія ініцыятывы".